# Тав. Чарвякоў аб політычным вагоне для вучняў Біра-Біджану

Справа організацыі Біра-Біджанскага яўрэйскага нацыянальнага раёну, які ў сваім разьвіцьці мае перетварыцца ў аўтономную яўрэйскую нацыянальную адзінку Саюзу ССР, мае вялізарнейшае політычнае і гаспадарчае значэньне.

Першыя перасяленцы ў Біра-Біджан—піонэры Біра-Біджану—павінны атрымаць магутнае падтрыманьне з боку ўсяе пролетарскае грамадзкасьці Саюзу ССР і ў першую чаргу з боку грамадзкасьці БССР—шэфа Біра-Біджану.

З гэтае прычыны пачын газэты «Юнгер ленінец» у організацыі культвагона вучням Біра-Біджану павінен знайсьці падтрымку ўсёй пролетарскай грамадзкасьці БССР. Дапамога газэце «Юнгер ленінец» будзе азначаць падтрымку Біра-Біджану і выкананьне шэфскіх абавязкаў перад Біра-Біраджанам.

Прывітанане „Юнгер ленінцу“

Усе на дапамогу Біра-Біджану!

А. ЧАРВЯКОЎ.